Пра выбар правільных шляхоў культурнага адзінства вялі гаворку ў Віцебску

20.07.2023 19:07 | Аўтар: Кастусь Лешніца | Грамадства

У апошнія гады ступень супрацоўніцтва органаў дзяржаўнага кіравання Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі ў гуманітарнай сферы, у галіне культуры набывае надзвычайныя маштабы. Найперш гэта дасягаецца за кошт канкрэтных праектаў. Шмат намаганняў прыкладаюць СМІ Саюзнай дзяржавы — вядомыя друкаваныя медыйныя пляцоўкі: газеты «Союз», «Союзное вече», часопіс «Союзное государство», а таксама электронныя сродкі інфармацыі — як тэлебачанне, так і лічбавыя сеткавыя праекты. Вялікая вага належыць культурным праектам — гастролям беларускіх тэатраў у Расію і наадварот, канцэртнай, музейнай дзейнасці. І, вядома ж, велізарная роля ў гэтым плане адведзена Пастаяннаму камітэту Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі.

Традыцыяй стала тое, што ў Беларусь з месяцу ў месяц прыязджаюць знакавыя постаці культуры і навукі Расійскай Федэрацыі. **Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў** генерыруе мноства ініцыятыў па сустрэчах, сумесных праектах паміж музеямі, тэатрамі, іншымі культурнымі і асветніцкімі ўстановамі нашых краін. Такая работа, несумненна, патрабуе абмеркавання, шырокіх разваг, усталявання глыбокага паразумення. І ўжо дакладна пляцоўкай дзеля вырашэння дадзенай задачы стаў традыцыйны круглы стол «Саюзная дзяржава — агульная духоўнасць і прастора магчымасцяў». Размова зацікаўленых асоб адбылася ў межах праграмы XXXII Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Мадэратарам круглага стала выступіла **генеральны дырэктар Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь, старшыня спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па падтрымцы таленавітай моладзі, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Кацярына Дулава.** Уступным словам дыскусію распачаў дзяржаўны сакратар Дзмітрый Мезенцаў. Дзмітрый Фёдаравіч адзначыў вартасці супольнай работы ў выхаванні грамадства, звярнуў увагу на тое, што ўжо зроблена Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы, падкрэсліў цесныя зносіны з міністэрствамі ўрада Беларусі — культуры і інфармацыі.

Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Дзмітрый Мезенцаў.

Важкія прыклады інтэграцыйнай работы па развіцці адзінай культурнай, духоўнай прасторы прывёў у сваім прывітальным слове **міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч.** Сярод тых дарожных карт, якія рэалізоўвае ў інтэграцыйным рэчышчы кіраўніцтва нашых краін, якія несупынна сцвярджаюць Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка і Прэзідэнт Расіі Уладзімір Уладзіміравіч Пуцін, культура займае істотнае месца. Анатоль Маркевіч звярнуў увагу на многія інтэграцыйныя навацыі ў галіне культурных, гуманітарных зносін апошнім часам. І наперадзе праяў такой супольнай работы дзеячаў культуры Беларусі і Расіі будзе яшчэ больш: як у тэатральным мастацтве, так і ў рабоце музейшчыкаў, мерапрыемствах вядучых бібліятэк нашых краін.

Удзел у абмеркаванні праблем узяў міністр культуры Рэспублікі Беларусь Анатоль Маркевіч (другі справа).

З цікавасцю слухалі дзеячы культуры выступленне **міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзіміра Пярцова,** які, адзначыўшы складанасці гістарычнага перыяду, падкрэсліў, што «ўсё сціскаецца пад уздзеяннем розных вострых і нават залішне вострых працэсаў, якія адбываюцца. Але шмат што праяўляецца: як людзі, так і міжнародныя адносіны. І што мы павінны зрабіць у нашай сферы для таго, каб працэсы, якія цяпер адбываюцца ў нас, выбудаваць у правільным рэчышчы, пазітыўным, канструктыўным напрамку па выхаванні, па ўздзеянні на нашых людзей, нашы народы ў эпоху, калі наша адзіная агульная прастора ўсё больш і больш знаходзіцца ў канфлікце з заходняй прасторай? Тыя культурныя каштоўнасці, якія цяпер актыўна культывуюцца ў заходнім свеце, нам у прынцыпе не падыходзяць ні па хрысціянскіх, ні па прыродных складніках. Мы супраць гэтага. І той сапраўдны твар, які цяпер гэты заходні свет у дачыненні да нашай цывілізацыі паказвае, — палітыка адмены, палітыка канфіскацыі, палітыка расчалавечвання. Гэтакая калька мінулага стагоддзя — стварэнне ўнтэрменша з нашых народаў». Якраз прывітальнае слова Уладзіміра Пярцова задало танальнасць размовы, акрэсліла пытанне: «Што рабіць у такі перыяд трансфармацыі культуры?» Уладзімір Барысавіч і адказаў на гэтае пытанне: «...варта звярнуцца ў першую чаргу да сваіх вытокаў, сваёй гісторыі, да свайго культурнага гена. Што ў нас закладзена. Нам ёсць чым ганарыцца. Культура — шлях да сэрца і душы гледача, слухача, чытача, і нам трэба намацаць гэты правільны шлях».

Выступае міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Уладзімір Пярцоў (першы злева).

Сапраўды, шлях, які ідзе праз культуру, даволі часта аказваецца прадукцыйным, эфектыўным у пабудове трывалай абароны ад бездухоўнасці. На гэтую тэму простымі і зразумелымі словамі гаварылі і іншыя ўдзельнікі круглага стала — **першы сакратар Цэнтральнага камітэта Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі Аляксандр Лук'янаў, рэктар Расійскай акадэміі музыкі імя Гнесіных Аляксандр Рыжынскі, генеральны дырэктар Цэнтра культуры «Віцебск», кіраўнік дырэкцыі Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» Глеб Лапіцкі, рэктар Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава, доктар эканамічных навук, прафесар Валянціна Багатырова, архіепіскап Віцебскі і Аршанскі Беларускага экзархата Рускай праваслаўнай царквы Дзмітрый...**

Цікавыя праекты вылучыў у сваім выступленні **генеральны дырэктар Расійскай нацыянальнай бібліятэкі Уладзімір Гронскі.** Па-першае, ён адзначыў, што Пастаянны камітэт Саюзнай дзяржавы распачаў выданне «Бібліятэкі Саюзнай дзяржавы». Убачылі свет першыя тамы гэтай унікальнай, разлічанай на ўвагу не толькі сённяшняга пакалення людзей, серыі. У 2023 годзе выйшла кніга «Тэрміну даўнасці не маюць...», у якой аб'яднаны красамоўныя факты, багаты ілюстрацыйны, архіўна-дакументальны матэрыял пра генацыд над беларусамі і расіянамі, над савецкімі людзьмі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Жахлівыя лічбы, вусцішныя факты не павінны застацца ляжаць у архіўным пыле. Дарэчы, калі кніга, зробленая дзякуючы арганізацыйным, творчым памкненням каманды Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы, прэзентавалася ў Дзень памяці ў сценах мемарыяльнага комплексу «Брэсцкая крэпасць-герой», **акадэмік Расійскай акадэміі навук, навуковы кіраўнік Інстытута ўсеагульнай гісторыі Расійскай акадэміі навук Аляксандр Чубар'ян** заўважыў наступнае: «Тэксты і расповеды злучаюцца тут з вялікай колькасцю архіўных і свежых дакументаў, дзе вайне даецца ацэнка, дзе абазначаны прызнаны факт генацыду савецкага народа. Гэта вельмі важна. Кніга робіць вельмі вялікае не толькі навуковае, але і эмацыянальнае ўражанне. А для маладога пакалення — гэта магчымасць дакрануцца да тэмы вайны і зразумець, што гэта велізарная трагедыя XX стагоддзя, якая ніколі не можа быць дараваная, не можа быць забытая. Таму такія важныя дыскусіі, што датычацца памяці пра вайну, а разам з тым і сучаснасці. Асабліва тых атак, якія ідуць сёння супраць нас»... А ў Віцебску, працягваючы размову пра «Бібліятэку Саюзнай дзяржавы», Уладзімір Гронскі распавёў пра тыя скарбы, якія захоўваюцца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу. У прыватнасці, ён звярнуў увагу на Полацкае Евангелле XII стагоддзя. Вядома, што існуе і яго факсімільнае выданне, зробленае невялікім тыражом (усяго 100 экзэмпляраў). Яно было ў свой час прэзентавана на адкрыцці XX Міжнароднай выстаўкі-кірмашу ў Мінску ў лютым 2013 года. **Генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін** падхапіў кніжную тэму, адзначыўшы памкненні беларускага боку ў аднаўленні старадаўніх кніг. Вадзім Францавіч сканцэнтраваў увагу прысутных на вартасцях развіцця цікаўнасці да чытання сярод моладзі. І ў гэтым плане асаблівую ролю, на яго думку, адыгрывае зварот да яркіх гістарычных постацяў, веды пра якіх павінны насіць масавы характар. Як, напрыклад, пра легендарную асобу Сімяона Полацкага, рускага і беларускага духоўнага пісьменніка, багаслова, паэта, драматурга, перакладчыка, настаўніка дзяцей рускага цара Аляксея Міхайлавіча. Фактычна творчыя крокі, здабыткі гэтай унікальнай асобы па праву ўзводзяць Сімяона Полацкага ў літаратурныя, паэтычныя папярэднікі Традзьякоўскага і Ламаносава, заўважыў Вадзім Гігін. «Псалтыр рыфматворны», які адзін з першых беларускіх і рускіх паэтаў выдаў у 1680 годзе, патрабуе новай увагі, магчымага перавыдання...

> **Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч** вярнуў удзельнікаў дыскусіі да тэмы Вялікай Айчыннай вайны, нагадаўшы, што наступны, 2024-ы — год 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. А яшчэ — і год 100-годдзя такіх яркіх пісьменнікаў-франтавікоў, як Барыс Васільеў, Уладзімір Багамолаў, Васіль Быкаў. Менавіта яны запачаткавалі новы, высокі ўзровень увагі чытача і ў Расіі, і ў Беларусі, ва ўсім Савецкім Саюзе да трагедыйнасці вайны, паказалі ўсе яе драматычныя складнікі на прыкладзе перажыванняў чалавека ў самых экстрэмальных сітуацыях. Так, Барыс Васільеў у 1974 годзе надрукаваў раман «У спісах не значыўся» пра лейтэнанта Плужнікава — абаронцу Брэсцкай крэпасці. Па матывах гэтага твора зняты мастацкі фільм «Я — рускі салдат». Уладзімір Багамолаў — аўтар легендарнага рамана «У жніўні сорак чацвёртага» («Момант ісціны») (твор перавыдадзены звыш 130 разоў!). На кінастудыі «Беларусьфільм» беларускім кінарэжысёрам Міхаілам Пташуком быў зняты мастацкі фільм «У жніўні 44-га...» Творы народнага пісьменніка Беларусі Васіля Быкава, чыя літаратурная праца адзначана званнямі Героя Сацыялістычнай Працы, лаўрэата Ленінскай прэміі, і сёння перавыдаюцца і ў Расіі, і ў многіх іншых краінах свету. Зварот да творчасці Багамолава, Васільева, Быкава сёння — магчымасць нагадаць свету пра вартасці міру ды пра жахі вайны. Так, кніга, мастацкае слова не спыняюць гарматныя, ракетныя стрэлы, але і мастацкая праўда — зброя, скіраваная на ўзвышэнне чалавека, на яго духоўныя памкненні, якія многае значаць у супрацьстаянні з разбуральнымі сіламі. Дарэчы, Міністэрства лічбавага развіцця, сувязі і масавых камунікацый Расійскай Федэрацыі прыняло рашэнне аб стварэнні арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 100-гадовых юбілеяў пісьменнікаў-франтавікоў У. Багамолава, В. Быкава, Б. Васільева.

...Круглы стол у Віцебску, арганізаваны Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы, прадэманстраваў высокі характар паяднання інтарэсаў, вызначэння мэт, якія з'ядноўваюць, развіваюць кансалідацыю беларусаў і расіян у развіцці агульнай інтэграцыйнай супольнасці. І культура, духоўнасць, гістарычная памяць адыгрываюць у дадзеным працэсе істотную ролю.

Кастусь ЛЕШНІЦА

Фота: БелТА

Навіны | Папулярнае

- 08:30 Беспілотнік трапіў у вышынны бізнес-цэнтр Масквы, прагрымеў выбух
- 08:09 МНС Беларусі адзначае зніжэнне колькасці пажараў
- 21:17 Навальніцы і месцамі ўзмацненне ветру чакаецца 24 ліпеня ў Беларусі
- 20:32 Мужчына патануў у кар'еры ў Гомелі
- 19:27 Падлетка з Віцебскай вобласці прыцягнулі да крымінальнай адказнасці за паведамленні аб ілжэмініраванні
- 18:52 Ахвярамі паводак у Афганістане сталі больш за 30 чалавек
- 18:20 Беларусы выйгралі срэбра і бронзу на чэмпіянаце Расіі па

УСЕ НАВІНЫ

Іншыя матэрыялы аўтара

- Паэзія Рыгора Барадуліна загучала на кітайскай мове
- У новым выпуску «Даляглядаў» — азербайджанская паэзія
- Лепельскімі сцежкамі
- Перабудова адукацыі: Прапановы ад Івана Шамякіна
- У газеце «Літаратура і мастацтва» змешчаны пераклады з узбекскай паэзіі